# Фарміраванне асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў па беларускай мове ў II класе



**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат педагагічных навук

### Метадычны каментарый па выкарыстанні дыдактычнага матэрыялу

У пачатку XXI ст. міжнародныя арганізацыі і перадавыя нацыянальныя сістэмы адукацыі звярнулі ўвагу на неабходнасць перамяшчэння акцэнту з прадметных ведаў на ўніверсальныя навыкі, трансфармацыю зместу школьнай адукацыі з пункту гледжання "ўніверсальных кампетэнтнасцей і новай граматнасці", якія дазваляць вучню эфектыўна прымяняць веды, уменні і навыкі ў практычнай дзейнасці, паспяхова выкарыстоўваць іх у працэсе сацыяльнай адаптацыі. "Новую граматнасць" складаюць дзве асноўныя катэгорыі:

*базавая інструментальная граматнасць* — чытацкая (чытаць і пісаць), матэматычная, вылічальная і алгарытмічная;

*базавыя спецыяльныя сучасныя веды і ўменні* — базавыя веды ў пэўнай галіне і навыкі іх прымянення (фінансавая граматнасць, экалагічная граматнасць, граматнасць у сферы здароўя і інш.) [1].

У Канцэпцыі вучэбнага прадмета "Беларуская мова" адзначаецца, што стратэгічнай мэтай моўнай адукацыі становіцца "фарміраванне сродкамі вучэбнага прадмета высокаадукаванай, высокакультурнай асобы, якая арганічна інтэгравана ў культуру народа, свядома і крытычна ўспрымае пачутае, асэнсавана чытае, правільна піша, свабодна гаворыць, выкарыстоўвае моўныя сродкі ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці са сваім індывідуальным развіццём, усведамляе моўныя з'явы і заканамернасці, валодае маўленчай этыкай і праяўляе творчыя здольнасці" [2, с. 54]. Для паспяховага дасягнення гэтай мэты важна, каб авалоданне мовай адбывалася ў комплексе з засваеннем спосабаў дзейнасці, якія спатрэбяцца вучню для рашэння разнастайных задач у рэальных сітуацыях жыццядзейнасці і ўзаемаадносін.

Навучанне беларускай мове на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі скіравана на авалоданне вучнямі моўнай, маўленча-камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай, сацыякультурнай кампетэнцыямі, дасягненне пэўных метапрадметных вынікаў навучання. Узнікае неабходнасць у распрацоўцы вучэбна-метадычнага забеспячэння па фарміраванні не толькі прадметных, але і ключавых (метапрадметных) кампетэнцый.

Варта адзначыць, што мова з'яўляецца не толькі сродкам назапашвання ведаў, фарміравання ўменняў і навыкаў, але і сродкам станаўлення асобы вучня. Авалоданне асобаснымі кампетэнцыямі адбываецца ў працэсе засваення сістэмы каштоўнасцей, правіл паводзін у грамадстве.

Фарміраванне асобасных і метапрадметных кампетэнцый павінна быць "уплецена" ў засваенне прадметных ведаў. Неабходна прадугледзець паступовае авалоданне вучнямі асобаснымі і метапрадметнымі кампетэнцыямі на спецыяльна падабраным матэрыяле.

У адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" вучні павінны авалодаць наступнымі метапрадметнымі ўменнямі:

✓ успрымаць і асэнсоўваць вучэбны матэрыял, які прад'яўляецца ў вербальнай форме, выдзяляць галоўнае ў ім, рацыянальна запамінаць, выконваць разумовыя аперацыі;

- ✓ выкарыстоўваць маўленчыя сродкі і сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для рашэння камунікатыўных і пазнавальных задач;
- ✓ працаваць з вучэбнай кнігай, іншымі друкаванымі і аўдыёвізуальнымі крыніцамі інфармацыі;
- ✓ працаваць з інфармацыяй (пошук, прымяненне, захаванне), рыхтаваць свае выступленне і выступаць з аўдыя-, відэа- і графічным суправаджэннем;
- ✓ слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў погляду, выказваць свае меркаванне і аргументаваць яго [3].

Чытацкая граматнасць выступае базавым (метапрадметным) уменнем. Уменне чытаць і разумець тэксты, працаваць з інфармацыяй розных тыпаў, жанраў з'яўляецца ўніверсальным сродкам навучання і саманавучання [4; 5]. Для таго каб малодшы школьнік стаў граматным чытачом, яму неабходна авалодаць наступнымі групамі чытацкіх уменняў, якія з'яўляюцца асновай разумення мастацкіх і інфармацыйных тэкстаў:

- ✓ знаходзіць і вычляняць з тэксту інфармацыю, на яе аснове рабіць простыя вывады;
- ✓ інтэграваць і інтэрпрэтаваць ідэі і інфармацыю з тэксту;
- ✓ асэнсоўваць і ацэньваць змест і форму тэксту.

Усе групы адзначаных чытацкіх уменняў узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Яны дзейнічаюць як адзінае цэлае [4; 5]. На I ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца станаўленне чытацкай граматнасці. Гэта досыць складаны і працяглы працэс. Фарміраванне чытацкай граматнасці на беларускіх тэкстах ва ўмовах руска-беларускага білінгвізму патрабуе асаблівай увагі з боку настаўніка. Змест заданняў па авалоданні трыма групамі чытацкіх уменняў неабходна ўскладняць у кожным наступным класе.

Намі былі падабраны тэксты, звязаныя з тэмамі, якія вывучаюцца на ўроках беларускай мовы ў II класе і дазваляць пашырыць веды вучняў у пэўнай галіне. Інфармацыя ў заданнях прадстаўлена ў вербальнай і невербальнай формах. Работа з рознымі крыніцамі інфармацыі будзе садзейнічаць фарміраванню ўмення рабіць абагульненне.

З мэтай фарміравання чытацкіх уменняў першай групы да тэкстаў прапануюцца заданні, якія матывуюць вучня засяроджваць увагу на дэталях, арыентавацца ў змесце тэксту, знаходзіць інфармацыю, прадстаўленую ў відавочным выглядзе, самастойна дапаўняць пэўную недасказанасць у тэксце, канкрэтызаваць інфармацыю прыкладамі з тэксту.

Для паспяховага выканання заданняў другой групы неабходна інтэграцыя трывала сфарміраваных прадметных і метапрадметных (пазнавальных, рэгулятыўных, камунікатыўных) уменняў. Заданні арыентуюць вучняў на ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязей, знаходжанне доказаў да сцвярджэнняў, рашэнне вучэбна-практычных задач (з апорай на прадметныя веды, інфармацыю з тэксту), фармулёўку вывадаў на аснове інфармацыі, прадстаўленай у тэксце і інш.

Трэцяя група чытацкіх уменняў патрабуе крытычнага погляду на прачытанае, выхаду за межы тэксту. Вучням прапануецца выказаць свае меркаванне на пэўную тэму, сфармуляваць абгрунтаванне ўласнага сцвярджэння, рашыць вучэбна-практычныя задачы з апорай на ўласны вопыт.

Варта адзначыць, што ў вучэбна-практычных задачах даецца апісанне сітуацый, максімальна набліжаных да рэальнага працэсу маўленчых зносін. Рашэнне вучэбна-практычных задач патрабуе выканання пэўных пазнавальных дзеянняў, умення рабіць абагульненні. Такія задачы не рашаюцца па гатовым узоры, а патрабуюць пошуку, прагназавання варыянтаў рашэння. Напрыклад, у адным з заданняў вучням неабходна прааналізаваць змест SMS-паведамлення, знайсці недакладнасць, унесці праўкі.

Прадстаўлены дыдактычны матэрыял настаўнік можа выкарыстаць пры вывучэнні тэм “Націск”, “Слова. Значэнне слова” для дыферэнцыяцыі навучання ў II класе, на стымулюючых, падтрымліваючых, факультатыўных занятках па беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, у пазакласнай рабоце. Час на работу з заданнямі настаўнік вызначае самастойна з улікам падрыхтаванасці класа.

У дыдактычным матэрыяле прапануюцца пытанні і заданні з выбарам адказу, з кароткім і разгорнутым адказам. Для арганізацыі працы настаўнік рыхтуе раздатачны матэрыял — бланкі для выканання задання.

## Дыдактычны матэрыял

### Тэма “Націск”

***Тэкст 1***

У беларускай мове націск у словах вольны. Ён можа знаходзіцца на любым са складоў слова. Напрыклад:

- на першым — мо́ра, со́рам, ру́жа;
- на другім — мара́к, саро́мецца, ружо́вы;
- на трэцім — марачо́к, сарамлі́вы, ружаве́ць і г. д.

Цікава, што ў свеце ёсць мовы, у якіх націск можа займаць у словах строга вызначанае месца, быць фіксаваным, замацаваным за пэўным складам. Так, у венгерскай, латышскай, фінскай, чэшскай, эстонскай мовах націск у словах знаходзіцца на першым складзе, у польскай — на перадапошнім, у французскай і казахскай — на апошнім.

*Паводле С. Зелянко* [6]

1. Запоўніце табліцу з апорай на тэкст. Пазначце знакам “+” склад, на які падае націск у мовах.

| Націск / мова | на першы склад | на апошні склад | на перадапошні склад |
|---|---|---|---|
| Казахская | | | |
| Беларуская | | | |
| Латышская | | | |
| Чэшская | | | |
| Эстонская | | | |
| Венгерская | | | |
| Французская | | | |
| Фінская | | | |
| Польская | | | |

*Уменне, што фарміруецца:* кадзіраваць інфармацыю ў невербальнай форме.

*Адказ:*

| Націск / мова | на першы склад | на апошні склад | на перадапошні склад |
|---|---|---|---|
| Казахская | | + | |
| Беларуская | + | + | + |
| Латышская | + | | |
| Чэшская | + | | |
| Эстонская | + | | |
| Венгерская | + | | |
| Французская | | + | |
| Фінская | + | | |
| Польская | | | + |

2. Вераніка прыехала з іншай краіны, якая мяжуе з Беларуссю. Дзяўчынка расказала, што ў яе роднай мове націск у словах знаходзіцца на першым складзе. З якой краіны прыехала Вераніка? Падкрэсліце адпаведную назву краіны на карце.




*Уменне, што фарміруецца:* рабіць выснову; прымяняць інфармацыю з тэксту для рашэння вучэбна-практычнай задачы; працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі.

*Адказ:* Латвія.

3. Вызначце націскны склад у словах. Размяркуйце словы на групы.

| | | |
|---|---|---|
| ______ склад | _______ склад | _______ склад |

сняжынка Снягурка снегавік снегавы снежны

*Уменне, што фарміруецца:* ажыццяўляць групоўку па вызначанай прыкмеце.

*Адказ:* першы склад — снежны; другі склад — сняжынка, Снягурка; трэці склад — снегавік, снегавы.

4. Пры вывучэнні якой мовы — беларускай ці польскай — прасцей засвоіць правілы вызначэння націску? Адзначце адказ ✓. Свой выбар абгрунтуйце.

☐ Пры вывучэнні беларускай мовы, паколькі ___
_______________________________________________

☐ Пры вывучэнні польскай мовы, паколькі ___
_______________________________________________

*Уменне, што фарміруецца:* аналізаваць інфармацыю, рабіць вывад на аснове інфармацыі, прадстаўленай у тэксце.

*Адказ:* пры вывучэнні польскай мовы, паколькі націск заўсёды падае на перадапошні склад, ён фіксаваны.

### *Тэкст 2*

Навошта ўмець правільна ставіць націск? Здаецца, вымавіў слова і ўсё! Аднак у некаторых словах націск вызначае сэнс слова, сказа. Параўнайце: *Мая любімая пара́ года — вясна. Новая па́ра рукавіц ляжала на камодзе.*

Розныя паводле значэння словы, якія аднолькава пішуцца, але маюць розны націск і не супадаюць у вымаўленні, называюцца амографамі.

1. Пра што новае вы даведаліся з тэксту? Сфармулюйце адказ адным сказам.

_______________________________________________

*Уменне, што фарміруецца:* аналізаваць атрыманую інфармацыю, супастаўляць яе з набытымі ведамі; адрозніваць новае і ўжо вядомае.

*Адказ:* што такое амографы.

2. Адзначце ✓ словы, якія з’яўляюцца амографамі.

☐ любы ☐ падручнік ☐ паліто
☐ мука ☐ каса ☐ сшытак

Уменне, што фарміруецца: прымяняць інфармацыю з тэксту для рашэння вучэбнай задачы; рабіць вывад з апорай на ўласны вопыт.

*Адказ:* любы, мука, каса.

3. У якіх мовах ёсць амографы? Адзначце ✓.

☐ у беларускай ☐ у польскай

☐ у рускай ☐ у французскай

*Уменне, што фарміруецца:* інтэграваць інфармацыю з розных крыніц; рабіць вывад, абапіраючыся на інфармацыю з тэксту і ўласны вопыт.

*Адказ:* у беларускай, у рускай.

4. Маці даслала Мішу SMS-паведамленне:

| |
|---|
| Сынок, паглядзі, колькі сала ў кашы. Напішы мне. |

Міша паглядзеў на стол і разгубіўся. Як вы думаеце чаму? Што не ўлічыла мама, калі набірала SMS-паведамленне? Удакладніце SMS-паведамленне, каб яно адпавядала другому малюнку.





*Уменне, што фарміруецца:* аналізаваць тэкставую інфармацыю, суадносіць яе з ілюстрацыямі; устанаўліваць сэнсавыя сувязі; вырашаць вучэбна-практычную задачу з апорай на ўласны вопыт.

*Адказ:* Міша не ведаў, куды глядзець: у кашу ці ў кош. Сказ можа мець рознае значэнне ў залежнасці ад таго, на які склад падае націск у апошнім слове (у ка́шы, у кашы́).

*Адказ:* "Сынок, паглядзі, колькі сала ў кашы́".

5. Як вы думаеце, ці можа быць маўленне зразумелым без націску? Абгрунтуйце.

Можа, паколькі ______________________________

______________________________________________

Не можа, паколькі ___________________________

______________________________________________

*Уменне, што фарміруецца:* разважаць, абапіраючыся на тэкст і ўласны вопыт; фармуляваць абгрунтаванне ўласнага сцвярджэння.

*Адказ:* не можа, паколькі маўленне будзе не зразумелым; людзі не будуць разумець адзін аднаго.

### Тэма "Слова. Значэнне слова"

Часам можна пачуць, што мова — "жывы арганізм". Такое цікавае азначэнне ёй вельмі падыходзіць.

Склад беларускай мовы, як і любой іншай, пастаянна пашыраецца. У Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы больш за 65 тысяч слоў!

Часам здараецца так, што асобныя словы па некаторых прычынах мяняюць сваё значэнне, становяцца малаўжывальнымі альбо нават знікаюць і забываюцца. Словы, якія ўжо шырока не выкарыстоўваюцца ў маўленні, але сустракаюцца ў мастацкіх творах, называюцца ўстарэлымі. Некаторыя ўстарэлыя словы ўвайшлі ў склад прыказак і прымавак.

*Паводле С. Зелянко* [7]

1. Пра што новае вы даведаліся з тэксту? Прывядзіце не менш за два варыянты адказу.

______________________________________________

______________________________________________

*Уменне, што фарміруецца:* аналізаваць атрыманую інфармацыю, супастаўляць яе з ужо набытымі ведамі; адрозніваць вядомае і невядомае.

*Магчымыя варыянты адказу:* якія словы называюцца ўстарэлымі; колькі слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове; некаторыя словы мяняюць сваё значэнне і інш.

2. Прывядзіце два доказы таго, што мова — "жывы арганізм".

1) ___________________________________________

______________________________________________

2) ___________________________________________

______________________________________________

*Уменне, што фарміруецца:* асэнсоўваць змест тэксту; знаходзіць у тэксце інфармацыю, якая з'яўляецца доказам сцвярджэння.

*Адказ:* 1) у мове з'яўляюцца новыя словы; 2) некаторыя словы знікаюць.

3. Уявіце, што вам неабходна знайсці значэнне якога-небудзь устарэлага слова. У якіх слоўніках вы **не** знойдзеце значэння гэтага слова? Адзначце ✓.




☐




☐




☐

*Уменне, што фарміруецца:* рабіць вывад на падставе інфармацыі з тэксту; прымяняць інфармацыю з тэксту для рашэння вучэбна-практычнай задачы.

*Адказ:* беларускі арфаграфічны слоўнік; перакладны слоўнік.

4. Пазнаёмцеся з інфармацыяй.

Устарэлымі словамі ў наш час лічацца, напрыклад:

**пуд** — мера вагі, крыху большая за 16 кг;

**дзіда** — старадаўняя колючая зброя ў выглядзе доўгага дрэўка з вострым металічным наканечнікам;

**лемантáр** — буквар;

**фальвáрак** — невялікая сядзіба пана, хутар.

Адзначце слова, якое ўжываецца сёння замест слова *дзіда*.

☐ відэлец

☐ меч

☐ кап'ё

*Уменне, што фарміруецца:* устанаўліваць сэнсавыя сувязі паміж азначэннем слова і варыянтамі адказу; інтэграваць інфармацыю з розных крыніц.

*Адказ:* кап'ё.

5. Дапоўніце прыказку патрэбным устарэлым словам з прапанаванага тэксту.

Каб пазнаць чалавека, трэба з ім ________ солі з'есці.

Як вы разумееце сэнс прыказкі? Сфармулюйце адказ адным сказам.

________________________________________

________________________________________

*Уменне, што фарміруецца:* знаходзіць у тэксце неабходную інфармацыю, аналізаваць яе, тлумачыць сэнс прыказкі з апорай на ўласны вопыт.

*Адказ:* пуд. Каб пазнаць чалавека, трэба пражыць з ім разам доўгі час.

6. Выберыце ўстарэлыя словы, якімі можна падпісаць малюнкі. Злучыце малюнкі з адпаведнымі словамі.

пуд    дзіда    лемантар    фальварак






*Уменне, што фарміруецца:* суадносіць тэкставую інфармацыю з ілюстрацыямі, устанаўліваць адпаведнасць.

*Адказ:* 1-шы малюнак — лемантар, 2-гі малюнак — дзіда.

7. Ева і Глеб прыдумалі назву прапанаванаму тэксту. З якой назвай вы пагаджаецеся? Адзначце ✓.

☐ Ева: Словы-дзеткі    ☐ Глеб: Словы-дзедкі

*Уменне, што фарміруецца:* інтэрпрэтаваць інфармацыю, устанаўліваць адпаведнасць паміж назвай тэксту і яго зместам.

*Адказ:* Глеб: Словы-дзедкі.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Универсальные компетентности и новая грамотность: чему учить сегодня для успеха завтра : предварит. выводы междунар. доклада о тенденциях трансформации шк. образования / И. Д. Фрумин, М. С. Добрякова, К. А. Баранников [и др.] ; Нац. исслед. ун-т "Высшая школа экономики", Ин-т образования. — М. : НИУ ВШЭ, 2018. — 28 с. — (Современная аналитика образования, № 2 (19)).
2. Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская мова" (V—XI кл.) : праект / Г. М. Валочка [і інш.] // Роднае слова. — 2016. — № 1. — С. 53—60.
3. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания : 2-й кл. / М-во образования Респ. Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2017. — 195 с.
4. Цукерман, Г. А. Читательские умения российских четвероклассников : уроки PIRLS-2016 / Г. А. Цукерман, Г. С. Ковалева, В. Ю. Баранова // Вопросы образования. Educational Studies Moscow. — 2018. — № 1. — С. 58—78.
5. Гулецкая, Е. А. Формирование метапредметных компетенций в учебной и внеучебной деятельности по русскому языку в IV классе / Е. А. Гулецкая // Пачатковая школа. — 2019. — № 10. — С. 6—19.
6. Зелянко, С. В. Сціслы аповед пра сціплы знак: націск : для мал. шк. узросту / С. В. Зелянко. — Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2018. — 32 с.
7. Зелянко, С. В. Словы-дзедкі і словы-дзеткі: гістарызмы і неалагізмы : для мал. шк. узросту / С. В. Зелянко. — Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2018. — 48 с.

*На дыску — карткі з заданнямі.*